# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## РЭЦЭНЗІЯ НА КНІГУ В.Ф. ШАЛЬКЕВІЧА "ГІСТОРЫЯ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ" (Мн., 1999)

Дадзеная кніжка нядаўна паступіла ў бібліятэкі рэспублікі, у тым ліку і ў бібліятэку БДЭУ. Яе аўтар вядомы даследчык грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі. Па гэтай тэматыцы ім апублікавана каля двухсот навуковых і навукова-папулярных прац. Як адзначана ў анатацыі да гэтай публікацыі, яна адрасавана студэнтам і выкладчыкам юрыдычных і гістарычных факультэтаў ВНУ ў якасці навучальнага дапаможніка. Прачытанне яе дае падставы сцвярджаць, што яна будзе карыснай для ўсіх, хто вывучае паліталогію, гісторыю дзяржаўнасці і права Беларусі.

Пытанні развіцця беларускай палітычнай і прававой думкі прыцягвалі ўвагу многіх грамадазнаўцаў. Пэўную навуковую спадчыну ў гэтай галіне ведаў пакінулі М.А. Алексютовіч, І.М. Лушчыцкі, А.С. Майхровіч, С.А. Падокшын, Е.С. Пракошына, І.В. Саверчанка, С.Ф. Сокал і іншыя даследчыкі. Па гэтай праблеме апублікавана даволі шмат манаграфій, раздзелаў у манаграфіях і артыкулаў. Дадзеная праца з'яўляецца першым ў рэспубліцы навучальным дапаможнікам, дзе у такім значным аб'ёме і з багатым зместам выкладаецца гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Сінтэтычны характар кніжкі, а менавіта спалучэнне паліталагічнай і правазнаўчай тэматыкі абумоўлена як сфарміраванай традыцыяй падачы такога матэрыялу, так і агульнасцю аб'екта даследавання паліталогіі і правазнаўства — дзяржава і дзяржаўная ўлада.

Прызначэнне дадзенай работы, яе навучальны характар абумовілі структуру кнігі. Акрамя ўводзін, у ёй 5 глаў, у якіх пасля факталагічнага і навуковага матэрыялу даюцца тэмы рэфератаў і дакладаў, а таксама літаратура, якая рэкамендуецца студэнтам для самастойнай работы. Такім чынам, публікацыя выконвае асноўную функцыю, аб якой заяўлена ў яе назве — дапамога студэнтам у навучанні дадзенай вучэбнай дысцыпліны.

Да важнейшых вартасцей кніжкі перш за ўсё трэба аднесці шматлікавасць мысліцеляў і дзяржаўных чыноўнікаў, працы, палітычныя і прававыя думкі якіх разглядаюцца ў ёй. Такі пантэон дзяржаўных дзеячоў навукі і культуры значна дадае гонару беларускаму этнасу і беларускай нацыі ў этатыскім сэнсе гэтага паняцця. Масавае авалоданне такой інтэлектуальнай спадчынай магло б інтэнсіфіцыраваць рост этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі, якая ў наш час паступова змяншаецца са згубленнем пазіцый беларускай культуры і мовы.

Навучальны дапаможнік падрыхтаваны на багатай базе першакрыніц і звестак, пачэрпнутых з апублікаваных даследаванняў. У лік першакрыніц уваходзяць жыццийная літаратура, летапісы, палітычныя памфлеты, пасланні, палітычныя трактаты і філасофскія сачыненні, творы рэлігійна-палемічнай літаратуры, прадмовы і ўступныя артыкулы да перакладзеных і выдадзеных беларускімі культурнымі дзеячамі кніг, творы мастацкай літаратуры, артыкулы такіх беларускіх газет, як "Мужыцкая праўда", "Наша доля", "Наша ніва", эпісталярныя творы. Пры напісанні сваёй кнігі В.Ф. Шалькевіч выкарыставаў матэрыялы з публікацый усходнеславянскіх даследчыкаў, польскіх, амерыканскіх, італьянскіх, нямецкіх, французскіх беларусазнаўцаў. Ужо адзін толькі пералік гэтых крыніц дае ўяўленне аб грунтоўнасці дадзенай працы.

Разгляд гісторыі развіцця беларускай паліталогіі і правазнаўства ў кнізе вядзецца згодна распрацаванай аўтарам перыядызацыі. У развіцці палітычнай і прававой думкі В.Ф. Шалькевіч выдзяляе 6 перыядаў: 1. Сярэдневякоўе (XI—XV стст.); 2. Адраджэнне і Рэфармацыя (канец XV і XVI стст.); 3. Контррэфармацыя і крызіс феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII — сярэдзіна XVIII стст.); 4. Век Асветы (другая палова XVIII ст.); 5. Перыяд з канца XVIII — пачатак XX стст.; 6. Перыяд Савецкай Беларусі і беларускага замежжа. Увогуле перыядызацыя мае рэальныя падставы, звязаныя як з іманентнасцю развіцця палітычнай і прававой тэорыі, так і з сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі працэсамі і іх асаблівасцямі ў пэўныя эпохі гісторыі Беларусі. Аўтару, на мой погляд, трэба было выдзеліць у асобны перыяд і наш час, у які адбываюцца якасныя змены ў палітычных навуках і правазнаўстве. Да таго ж заўважу, што даючы характарыстыку перыяду Савецкай Беларусі і беларускай эміграцыі мэтазгодна было б назваць больш вядомых палітолагаў і правазнаўцаў з асяроддзя беларускіх эмігрантаў. Некаторыя іх працы зараз паступаюць у бібліятэкі Беларусі, і студэнты, якія валодаюць замежнымі мовамі, маглі б падрыхтаваць цікавыя рэфераты і даклады па публікацыях замежных беларусазнаўцаў.

Каштоўнасці надае дадзенаму навучальнаму дапаможніку разгляд палітычных і прававых ідэй на гістарычным фоне развіцця беларускай дзяржаўнасці, эканомікі і культуры. Безумоўна, такі сістэмны падыход дазваляе чытачу лепей зразумець сутнасць гэтых ідэй. Да таго ж вывучэнне палітычнай і правовай думкі ў цеснай узаемасувязі з разнастайнымі грамадскімі працэсамі ўзбагачае інтэлект студэнтаў, фарміруе шырокі цывілізацыйны светапогляд. Трэба адзначыць, што гісторыка-грамадскі фон, хаця ён месцамі і даволі значны, не затушоўвае звесткі і іх аналіз, якія фарміруюць прадметны змест дадзенай вучэбнай дысцыпліны. І гэта вельмі важна пры тым, што многія ідэі беларускіх мысліцеляў дайшлі да нас не з першакрыніц, а праз пасрэднікаў, альбо падаюцца ў кантэксце летапісаў, мастацкіх твораў, прадмоў і пасляслоўяў да рэлігійных кніжак і носяць часта фрагментарны характар.

Не абыйсціся ў такой працы і без біяграфічных звестак аб беларускіх мысліцелях, яны цікавы не толькі самі па сабе, бо даюць ўяўленне аб жыцці беларускай інтэлігенцыі розных гістарычных эпох, але і вучаць сучасную моладзь патрыятызму, адказнасці і іншым добрым маральным якасцям.

Гаворачы аб маралі, хочацца адзначыць, што як паказваюць матэрыялы навучальнага дапаможніка, многія беларускія мысліцелі (Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына і інш.) акцэнтавалі асаблівую ўвагу на сувязі маралі і палітыкі, маралі і права. Яны падкрэслівалі важнасць маральных прынцыпаў у паводзінах і дзейнасці як правіцеляў, так і падданых. Улік гэтай сувязі ў сучаснай палітычнай тэорыі і практыцы вельмі актуальны і ў наш час. Злабадзённымі для сучаснасці з'яўляюцца ідэі беларускіх вучоных, гуманістаў, асветнікаў, палітычных дзеячоў адносна служэння агульнаму дабру, стварэння прававой дзяржавы, выхавання патрыятызму, верацярпімасці.

Шматлікія матэрыялы публікацыі сведчаць аб тым, што ў разгледжаны ў ёй гістарычны перыяд беларуская палітычная і прававая думка развівалася ў цеснай сувязі з заходнееўрапейскай культурай. Перадавыя для таго часу ідэі Адраджэння, Рэфармацыі, Асветніцтва прыносіліся на Беларусь яе выхадцамі, якія вучыліся ў лепшых навучальных установах Еўропы і працягвалі падтрымліваць цесныя кантакты з навуковай інтэлігенцыяй і рознымі дзяржаўнымі дзеячамі, грамадскімі (найчасцей рэлігійнымі) аб'яднаннямі ў час сваёй самастойнай навуковай, палітычнай і асветніцкай дзейнасці. Але перадавыя ідэі не толькі адэкватна ўспрымаліся беларускімі мысліцелямі і грамадскімі дзеячамі, але і адаптаваліся і мадэрнізаваліся імі ў мясцовых умовах, набывалі пры гэтым пэўную арыгінальнасць, якая ў сваю чаргу ўносіла адметныя штрыхі ў мазаіку агульнаеўрапейскай культуры.

Нажаль, гістарычны нарыс палітычнай і прававой думкі ў навучальным дапаможніку заканчваецца векам Асветы, і, такім чынам, засталіся неразгледжанымі пазнейшыя перыяды, якія таксама ў паліталогіі і правазнаўстве характарызаваліся цікавымі ідэямі і канцэпцыямі. Хочацца спадзявацца, што В.Ф. Шалькевіч працягне сваю навуковую працу ў гэтым накірунку, і з цягам часу масавы чытач зможа пазнаёміцца з другой часткай гэтай гісторыі.

*Іван Мікалаевіч БРАІМ, прафесар кафедры паліталогіі БДЭУ, кандыдат гістарычных навук*